№ 06 (455)
Люты 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Традыцыя: лялька для немаўлятак – стар. 2

☞ Юбілей: 25 гадоў часопісу «Роднае слова» – стар. 3

☞ Помнае: беларускі хлопец на афганскай вайне – стар. 4

Нам пра нас

Здабыткі «Краязнаўчай газеты»

З краязнаўчай працаю я сутыкнулася ў бібліятэцы, а неўзабаве і сама пачала займацца краязнаўствам. З цікавасцю адкрываю кожны нумар «Краязнаўчай газеты»: а можа, і пра нашую Клеччыну напісана што-небудзь новае? Адсюль жа бяру на заметку шмат цікавага і карыснага з досведу працы іншых бібліятэк. Аднойчы адважылася напісаць аб краязнаўчай дзейнасці сваёй бібліятэкі. Надрукавалі. Дзякую. Потым былі яшчэ артыкулы.

Я лічу, што «Краязнаўчая газета» з'яўляецца пасрэднікам паміж краязнаўцамі, а павучыцца ёсць чаму ў людзей, папоўніць свае веды і аб сабе расказаць.

У Беларусі шмат гістарычных падзеяў, мясцінаў, знакамітых людзей, якія даюць магчымасць ганарыцца сваёй краінай, яе гісторыяй, здабыткамі, культурай. Гэтыя крупінкі гонару і збірае «Краязнаўчая газета» ў рубрыках «Наша гісторыя: ідэі, падзеі, асобы», «Традыцыі і сучаснасць», «Рэгіёны», «Царкоўнае краязнаўства» і іншыя. Але газетны матэрыял настолькі разнастайны, што яго нельга ўціснуць у рамкі рубрык: даследаванні, адкрыцці, падзеі і факты, імёны, святы, абрады, лексіка, тапаніміка і г.д. Толькі чэрпай матэрыял і карыстайся.

Кранула рубрыка «Спадчына ў небяспецы», таму што помнікі гісторыі і архітэктуры, якія знаходзяцца ў небяспечным стане, ёсць у кожным рэгіёне. І аб гэтым нельга маўчаць.

Цікавыя матэрыялы друкуюць мясцовыя краязнаўцы. Дзякуючы ім асобныя рэгіёны захавалі звесткі пра багатае мінулае свайго краю.

Нашаму раёну пашанцавала, бо ёсць і ў нас краязнаўца-энтузіяст, вялікі аматар гісторыі Клеччыны – Андрэй Блінец. Друкавалася шмат яго артыкулаў у раённай газеце пад рубрыкай «Карані». «Краязнаўчая газета» таксама неаднойчы друкавала яго даследаванні. Уся яго праца вылілася ў кнігу «Клецк. Старонкі даўняй гісторыі». І нам вельмі прыемна, што пасля прэзентацыі кнігі цікавасць да гісторыі Клеччыны ўзрасла, мяркуючы па запытах карыстальнікаў бібліятэкі.

Плённай працы табе, «Краязнаўчая газета», цікавых аўтараў, карыснай інфармацыі!

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
бібліятэкар Клецкай раённай бібліятэкі

На тым тыдні...

✓ **5 лютага** ў мастацкай галерэі ЛаСандр-арт адбылася **прэзентацыя выстаўкі працаў Яўгена Красоўскага** (1908–1980). Мастак працаваў у тэхніках графікі, жывапісу, акварэлі, стварыў экслібрысы. Упершыню экспазіцыя папоўнілася працамі Аляксандра, сына Я. Красоўскага, які захоўваў працы бацькі.

Выстаўку можна наведаць да 2 сакавіка.

✓ **З 6 па 10 лютага** ў Мінску праходзіла **XX Міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш**, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі 25 краінаў свету. Сёлета да традыцыйнага штогадовага кірмашу далучыліся новыя ўдзельнікі – Палесціна і Сербія. Цягам пяці дзён праходзілі прэзентацыі кніг, аўтографсесіі літаратараў, семінары, лекцыі, літаратурныя сустрэчы за круглым сталом, канцэрты і шмат іншага. Кнігі ў падарунак беларускім бібліятэкам перадалі прадстаўнікі Расіі і Германіі. У рамках выстаўкі былі вызначаныя пераможцы 52-га конкурсу «Мастацтва кнігі» і конкурсу кніжных экспазіцыяў.

Падрабязней пра выстаўку-кірмаш чытайце ў наступным нумары газеты.

✓ **7 лютага** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва пачне працу выставачны **праект «Практыка рынкавага рэалізму»** Уладзіміра Цэслера, чалавека-брэнда, які з'яўляецца адной з яркіх асобаў беларускай мастацкай прасторы на сённяшні дзень. Аўтара хуліганскіх рэкламных плакатаў, якія знаходзяцца ў фондах вядомых на ўвесь свет музеяў, стваральніка кітчавых і незабыўных прадметаў ужытку і іранічных арт-аб'ектаў.

На выстаўцы прадстаўленыя працы ў тэхніках жывапісу, скульптуры і арт-аб'екты.

Выстаўка працягнецца да 2 сакавіка.

✓ **7 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася **вечарына, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння Нэлі Тулупавай**, паэтэсы, празаіка, перакладчыцы.

У вечарыне бралі ўдзел вядомыя паэты і пісьменнікі (Казімір Камейша, Анатоль Вярцінскі, Раіса Баравікова, Зміцер Пятровіч), артыстка Белдзяржфілармоніі Зінаіда Феакцістава, салістка фальклорнага гурта «Вербіца» Жана Швед і інш. У рамках імпрэзы адбылася прэзентацыя кнігі ўнучкі паэтэсы Валерыі Радунь «След дождя».

✓ Тамсама **8 лютага прэзентавалі зборнік перакладаў украінскай прозы Юрыя Кур'яновіча «Цвітуць сланечнікі»**, куды ўвайшлі апавяданні заходнеўкраінскіх пісьменнікаў Івана Грэгуляка і Наталлі Радыш, а таксама Пятра Франко. У перакладзе на беларускую мову творы друкуюцца ўпершыню.

У фае музея прадстаўленая экспазіцыя фотаздымкаў Ю. Кур'яновіча з серыі «Подых Карпатаў», прысвечаныя Гуцульшчыне (Заходняя Украіна).

✓ **9 лютага** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы стартаваў **пілотны праект «Гадзіна мастацтва»**. Гэтым разам юныя творцы з Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў і студыі выяўленчага мастацтва Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі пасля экскурсіі па выстаўцы «Сустрэчы з Гофманам» і эксклюзіўнага прагляду мультыплікацыйнага фільма атрымалі магчымасць стварыць сваю працу, прысвечаную Эрнсту Тэадору Вільгельму Гофману і яго творам.

Акцыя адбылася ў рамках Міжнароднага выставачнага праекта «Гафманіяна», што ўжо 7 гадоў яднае аматараў творчасці пісьменніка: у выстаўках прынялі ўдзел больш за 90 мастакоў, каля 1 000 твораў жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, інсталяцыяў, аўтарскіх лялек. Працы адлюстравалі пераборлівую, мудрагелістую натуру Фантазуса, галоўнага героя твораў пісьменніка.

Пад абярэгам светлага дзяцінства

Простыя словы,
простыя рэчы,
Хлеб на стале, полымя ў печы.
Гэта так проста,
гэта так добра,
Як з галавою залезці
пад коўдру...

Чуеш гэтыя радкі песні «Простыя словы» ў выкананні гурта «NRM» – і поўнішся той чароўнай казкай дзяцінства, дзе самае прыемнае атаясамліваецца з простымі, здаецца, словамі і рэчамі. Але самае цёплае і ўтульнае месца – пад коўдрай. Што казаць, цяжкавата ўявіць яго без цацкі, якую (успомніце самі!) клалі пад бок, сагрэючыся і супакойваючыся пасля напоўненага ўражаннямі дня. Апякункай дзіцячага сна ў нашых продкаў выступала спецыяльная лялька, якую рабіла будучая маці для свайго дзіцяці. Менавіта па вырабе такой лялькі 29 студзеня ў філіяле Веткаўскага музея старавабрадніцтва і беларускіх традыцыяў імя Ф.Р. Шклярава ладзіўся майстар-клас, куды завіталі вучні 4 «Б» класа Гомельскай САШ № 50 са сваімі настаўнікамі Т. Прымак і А. Сіковай.

Чароўнае дзейства пачалося калыханкай у выкананні В. Міронавай, рэдактара сайта Веткаўскага музея. Нібы зачараваная, слухала дзятва спевы сп. Валянціны. Не паспелі вучні адысці ад «гіпнозу» калыханкі, як іх увагай завалодаў Пятро Цалка, загадчык філіяла Веткаўскага музея, і адразу адправіўся з дзецьмі ў мінулае. Так, лялька-апякунка маленства мела некалькі назваў: вепская лялька (ад народа, які яе вырабляў), «капустка» або «рванка» (па яе знешнім выглядзе). Рабіла ляльку дзяўчына, якая ўжо была гатовая выйсці замуж. Зрабіўшы ляльку, дзяўчына ставіла яе на падаконнік, і хлопцы, якія ішлі паўз хату, бачылі, што дзяўчына гатовая да замужжа, да таго, каб нарадзіць дзіця. «Капустку» дзяўчына клала ў калыску яшчэ да нараджэння дзіцяці. Увогуле існавала забарона калыхаць пустую люльку, бо яна магла застацца пустой назаўсёды. «Калыхаць нячыстага», казалі ў такім выпадку.

Ляльку дзяўчына рабіла са старога адзення: са сваёй спадніцы, кашулі – усяго, што было напрамую звязанае з ёю. Такім чынам частку самой сябе перадавала дзяўчына будучаму дзіцяці. Да самага нараджэння дзіцяці ляжала «рванка» ў люльцы. Спяваючы ёй песні, калыхаючы яе, дзяўчына маральна рыхтавалася да сапраўднага нараджэння. Лялька грэла калыску, таму дзіця, калі з'яўлялася на свет, клалася ў цёплую калыску, сагрэтую пяшчотай і дабрынёю маці. Лялька, зробленая са шматкоў адзення маці, была правобразам маці, брала на сябе яе абавязкі: наглядала за дзіцём, забаўляла яго. Лічылася, што дзіця ў такім выпадку абароненае ад сурокаў, ад нядобрага злога вока. Калі дзіця падрастала, яму давалі гуляць з лялькай, паколькі небяспекі, што дзіця можа ўкалоцца ці парэзацца ёю, не было.

Правёўшы экскурс у мінулае, Пятро крок за крокам паказаў, як з простых кавалачкаў старога адзення можна стварыць сучасны абярэг. Паколькі выраб любой лялькі не дапускае выкарыстання колкіх і рэжучых прадметаў, то і выраб «капусткі» не выключэнне. У адваротным выпадку дзіця будзе гэткае ж «колкае» і няўжыўчывае. Невялікі кавалачак белай матэрыі (галаву лялькі) цяпер можна напоўніць сінтэпонам. Два кавалачкі каляровай матэрыі ў форме шара, напоўненыя сінтэпонам, звязваюцца разам – гэта будуць грудзі лялькі. Пераглядваецца дзятва, параўноўваючы адно з другім свае «нарыхтоўкі».

Далей ідзе выраб рук: кавалачак тканіны ў форме квадрата перакладаецца па дыяганалі. Трохкутнічак, што атрымаўся, таксама перакладаецца, а пасля яшчэ раз. Каб зрабіць далоньку, дзюбачку трохкутнічка, на якой трымаюцца складкі кавалачка, патрэбна перавязаць чырвонай нітачкай, нібы бранзалецікам. Такім чынам робіцца другая ручка дзіцяці. Далей адбываецца стыкоўка: ручка прыстаўляецца да шыйкі галоўкі-макаўкі і абгортвае тулава лялькі, тое ж робіцца і з другою ручкай. Краі, што ахінаюць ляльку, перавязваюцца ніткай. Не ўсё адразу атрымлівалася ў «рукадзельнікаў», як яны сябе ахрысцілі, таму асістэнты і настаўнікі дапамагалі сваім падапечным. Далей да цела «капусткі» прымацоўваюць грудзі – і адразу пачынае рабацець у вачах ад каляровых шматочкаў. Да распраўленых на целе лялькі шматочкаў прыладжваюць, ад паясніцы ўверх фартушкі. Пасля самае складанае – выраб спаднічкі: кавалак тканіны збіраецца, нібы веер, і прымацоўваецца да спіны лялькі, таксама – ад паясніцы ўверх. Проста сказаць, а колькі спатрэбілася цярпення, каб ляльку «ўзнагародзіць» спадніцай. Аднак нашыя «стылісты» не з тых, хто кідае справу на перадапошняй прыступцы. Так, бо засталося апошняе ва ўборы нашай прыгажуні – хусцінка. Пытанні, што ўвесь час суправаджалі дзейства, не засталіся без адказу. А неўзабаве дзятва шчыра хвалілася сваімі прыгажунямі.

Як бачым, нялёгкі шлях ад напаўнення першага кавалачка сінтэпонам да прымацавання апошняга кавалка. Шмат спатрэбілася цярпення і ўседлівасці, каб зрабіць абярэг дзіцяці. Але менавіта такім чынам яна, будучая маці, «вучылася быць» дарослай. Да таго ж, праз выраб лялькі выхоўвалася пераемнасць традыцыяў ад аднаго пакалення да другога. Як абярэг самай светлай і шчырай пары жыцця «капустка» з'яўлялася правобразам ідэала, шчасця чалавека. Таму такая трывалая дзіцячая памяць, якая прымушае ўстрапянуцца, калі раптам пачуеш простыя словы:

Усё так надзейна,
усё так грунтоўна,
Што тут дадаць?
Хіба што нічога.
Можна жыць далей,
дзень прыйдзе новы.
Дабранач, паненкі,
дабранач, панове.

Простыя словы...

Марына ДАВІДЗЮК,
г. Гомель,
фота аўтара

Індывідуальная падпіска	Індэкс 63320
1 месяц	15 850 руб.
3 месяцы	47 550 руб.
6 месяцаў	95 100 руб.

Ведамасная падпіска	Індэкс 633202
1 месяц	16 196 руб.
3 месяцы	48 588 руб.
6 месяцаў	97 176 руб.

Падпісацца на нашую газету можна ў любым месяцы. Будзьма разам, сябры!

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

АБАНЕМЕНT *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Кошт	падпіскі	_____руб.	Колькасць камплектаў	
	пераадрасоўкі	_____руб.		

на 20__ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Летапісы і жыццяпісы Міколы Купавы

У апошні дзень студзеня Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа сабраў у сваіх утульных сценах усіх, хто меў жаданне дакрануцца да жывой гісторыі. Пад дахам Коласавага дома была прачытаная яшчэ адна яе не ўсім вядомая старонка. Кожны з гасцей музея, напэўна, зрабіў для сябе асабістыя адкрыцці, тым больш што атмасфера гэтаму надзвычай спрыяла. «Нефармальная, амаль сямейная», – так ахарактарызавала вечарыну намеснік дырэктара музея па навуцы Ганна Зайцава, і мела рацыю.

Галоўнай нагодаю імпрэзы стала сустрэча з выбітным мастаком Міколам Купавам. Пад час вечарыны ён прадставіў два свае альбомы – «Якуб Колас у творчасці Міколы Купавы» і «Янка Купала ў творчасці Міколы Купавы». Створаныя цягам некалькіх дзясяткаў гадоў у тэхніках акварэлі, графікі, каляровай літаграфіі, яны ўяўляюць сабой своеасаблівы мастацкі летапіс жыцця двух класікаў. Зрэшты, больш правільна было б назваць працы майстра мастацкімі дакументамі – з такой дакладнасцю і ўвагай да дробязяў яны зробленыя. «Тут ёсць дэталі, якія можна было апусціць, – проста кажа М. Купава, – але яны ўсё-такі з'явіліся». У гэтым мастаку шмат дапамагалі Міхась Міцкевіч, малодшы сын Якуба Коласа, і даследчык літаратуры Уладзімір Содаль.

М. Купава

Варта адзначыць, што М. Купава – адзін з нешматлікіх беларускіх мастакоў, які ў сваёй творчасці звярнуўся да тэмы так званай мастацкай карты. Ён стварыў серыю выяваў тых мясцінаў, дзе рос і сталеў Кастусь Міцкевіч, і аб'яднаў іх у адной працы. Як расказаў слухачам мастак, у яго ёсць задума стварыць паводле гэтага ж прынцыпу і карту Вялікага Княства Літоўскага.

Але, акрамя прэзентацыі альбомаў, у імпрэзы была яшчэ адна нагода – менавіта 31 студзеня, толькі з розніцай у дваццаць гадоў, нарадзіліся Міхась Міцкевіч і Мікола Купава. Іх шчыра віншавалі ўсе прысутныя, а навучэнцы гімназіі-каледжа імя Ахрэмчыка выканалі песню «Мілавіца» на словы Уладзіміра Някляева.

«Мікола Купава аддае свае сілы, свой талент, сваё сэрца, каб данесці да нас гістарычную памяць нашага мінулага, – зазначыла Г. Зайцава. – А нядаўна нам стала вядома, што яшчэ адным жыццёвым клопатам мастака з'яўляецца захаванне архітэктурнай спадчыны роднай яму Оршы». Купава збірае сродкі на аднаўленне базыльянскага кляштара – сёння будынак стаіць нават без даху. І няма сумневу, што рана ці позна, але гэтая мэта будзе дасягнутая – вялікія справы, тым больш калі іх робяць такія людзі, проста мусяць быць здзейсненымі.

Ніна КАЗЛЕНЯ
Фота аўтара

Данжон айчыннай культуры

Часопісу «Роднае слова» – 25!

Першы нумар часопіса выйшаў у 1988 г. Выданне задумвалася як дапаможнае для настаўнікаў-беларусістаў і напачатку называлася «Беларуская мова і літаратура ў школе». Яго першы рэдактар і заснавальнік Міхась Шавыркін імкнуўся напоўніць старонкі беларусацэнтрычнымі папулярнымі матэрыяламі – і часопіс неўзабаве перарос вузкую школьную тэматыку і стаў «Родным словам». У 1990-я гг., часы шырокай запатрабаванасці беларускага слова і адраджэнцкай інфармацыі, яго тыраж перасягаў 13 тысячаў асобнікаў.

Сёння «Родным словам» кіруе і апякуецца паэтка Зоя Падліпская, мужна баронячы самастойнасць установы, знаходзячы выхады з эканамічных пастак ва ўмовах адсутнасці дзяржаўнай фінансавай падтрымкі (нядаўна «Роднае слова» атрымала ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць і пачало складаць уласна надрукаваную бібліятэку).

Выданне лучыць на старонках самых розных аўтараў. Настаўнікі па-ранейшаму прапануюць канспекты ўрокаў па роднай мове і літаратуры, метадычныя распрацоўкі, сцэнары мерапрыемстваў. Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Беларусі для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па філалагічных і педагагічных навуках, мастацтвазнаўстве і культуралогіі: тэксты маладых даследчыкаў-аспірантаў суседнічаюць з матэрыяламі слынных навукоўцаў. Такім чынам акадэмічная навука даходзіць да педагогаў-практыкаў і навучэнцаў. Цікавыя публікацыі дапамагаюць маладому пакаленню засвойваць літаратурную і моўную спадчыну ў арганічнай сувязі з нацыянальна-культурнымі здабыткамі нашай Бацькаўшчыны. Матэрыялы пра гісторыю і сучасны стан музыкі, выяўленчага, тэле- і кінамастацтва спрыяюць фармаванню эстэтычнай культуры моладзі. Галоўны герой усіх публікацыяў – Беларусь, яе мова, культура, яе слынныя сыны і дочкі.

Прыемна, што святочнае мерапрыемства з нагоды 25-годдзя часопіса (якое адбылося ў памяшканні беларускамоўнай 23-й мінскай гімназіі дзякуючы руплівасці яе дырэктаркі Ніны Нікіцінай) наведалі многія выбітныя асобы краіны, ад якіх залежыць лёс і выдання «Роднае слова», і Слова Роднага штодзённага. Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч адзначыў, што часопіс спрыяў прафесійнаму станаўленню не аднаго педагагічнага пакалення, а клопат калектыву рэдакцыі пра захаванне і прапаганду роднага беларускага слова, нацыянальнай спадчыны, асвятленне пытанняў моўнай і літаратурнай адукацыі дапамагае моладзі правільна вызначаць жыццёвыя арыенціры, спрыяе выхаванню маладога пакалення ў павазе да роднай зямлі і культуры свайго народа.

С. Маскевіч, З. Падліпская, Т. Стружэцкі і А. Каваленя

Гарод выступоўцаў былі намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэуш Стружэцкі, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Каваленя, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Лукашанец, пісьменнікі Генадзь Пашкоў, Міхась Пазнякоў, Славамір Антановіч, кіраўнікі педагагічных сродкаў масавай інфармацыі Мікалай Супрановіч, Наталля Ваніна, Алесь Бельскі, Ала Маслава, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ Віктар Іўчанкаў, даследчык гісторыі беларускай шляхты і пастаянны аўтар «Роднага слова» Анатоль Статкевіч-Чабаганаў, дацэнт Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (былы галоўны рэдактар часопіса) Уладзімір Куліковіч.

Здобілі вечарыну выступленні пісьменніка і музыканта Аляксандра Вашчанкі, народнай студыі традыцыйнай творчасці «Жыцень» гімназіі № 23 (кіраўнік Ірэна Іскрык), узорнага калектыву «Жарт» Цэнтра дадатковай адукацыі «Светач» Савецкага раёна Мінска (кіраўнік Ларыса Гайдук).

Беларусь называюць краінай замкаў. Хочацца, каб яе беларускамоўныя выданні, установы, арганізацыі не ўзвышаліся рэдкімі самотнымі данжонамі над забалочанымі пусткамі, а стваралі магутны гарманічны рознакаляровы архітэктурны ансамбль без руінаў і прабелаў, у гучнай суладнай сімфоніі Роднага Слова.

Крысціна ПУЧЫНСКАЯ
Фота Канстанціна ЛІСЕЦКАГА

Выступае гімназічная студыя «Жыцень»

Пры чым тут Пятроўскі ўказ?

Вось і пачаўся 2013 год. Паводле ўсходняга календара з лютага гэта год змяі. Дык будзем жа мудрымі, як змяя. Будзем любіць сваю зямлю, культуру, найпрыгажэйшую мову, помніць гісторыю нашай дзяржавы, якая некалі называлася не толькі Беларусь, БССР, БНР, але і ВКЛ – Вялікае Княства Літоўскае.

Тут я хацеў бы распавесці, як у адной з крамаў купіў «Настольный перекидной календарь-ежедневник на 2013 год. Редактор-составитель А.П. Костелецкая», выдадзены ў Беларусі.

Дзякуй за каляндар, якім я штодзённа карыстаюся. Але ж хочацца выказаць некаторыя заўвагі аб ім.

Шкада, што ён напісаны (у асноўным) на рускай мове, а не на беларускай – першай дзяржаўнай мове тытульнай нацыі.

На старонцы за 2 студзеня чытаю: «Почему на Новый год украшают ёлку?.. Начинался он весной, в марте. И только по Петровскому указу, оглашённому 15 декабря 1699 года, праздновать его стали 1 января…».

Хочацца спытаць складальніцу календара: пры чым тут Пятроўскі ўказ? Якія адносіны ён меў да нашай у той час незалежнай краіны Вялікага Княства Літоўскага – амаль за сто гадоў да таго, як яна была захопленая Расіяй? З такім жа поспехам можна спасылацца на ўказы кітайскіх імператараў…

І яшчэ. Хочацца ведаць, калі ж на самой справе на беларускіх землях святкавалі пачатак Новага года?

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ, г. Мінск

«Віцебская харугва»

У Віцебску ў выставачнай зале «Духаўскі круглік» адбылося адкрыццё выстаўкі «Віцебская харугва». Яна праходзіць у рамках аднайменнага праекта і арганізаваная Цэнтрам культуры «Віцебск» і народным калектывам – клубам гістарычнай рэканструкцыі «Варгенторн», які ўжо блізу 10 гадоў займаецца вывучэннем матэрыяльнай культуры насельніцтва Днепра-Дзвінскага рэгіёну. Выстаўка знаёміць наведнікаў з матэрыяльнай культурай жыхароў Віцебска XVII стагоддзя.

Удзельнікі клуба «Варгенторн» адважыліся на тытанічную працу, бо дакладнае аднаўленне таго ж сцяга ці харугвы запатрабавала дэталёвага вывучэння архіўных матэрыялаў, супрацоўніцтва з замежнымі навукоўцамі і майстрамі і, нарэшце, стамляльнай фізічнай працы. Акрамя самой харугвы ў экспазіцыі можна пабачыць рэканструкцыю тагачаснага шляхецкага і мяшчанскага адзення, абутку і зброі. Кіраўнік клуба Сяргей Бабенка пад час адкрыцця выстаўкі нават прадэманстраваў, як правільна карыстацца зброяй, за чым з асаблівым захапленнем назіралі прысутныя, а адна жанчына пацікавілася, ці можа гэтае ружжо стрэльнуць.

Паклапаціліся арганізатары і пра забаўкі для гасцей: на верхнім паверсе «кругліка» іх чакала музыка, спевы і медавуха ў якасці пачастунку. Выстаўка будзе працаваць на працягу месяца, таму «паглядзець на XVII стагоддзе» паспее нямала жыхароў і гасцей горада. І нават па яе заканчэнні праект «Віцебская харугва» не скончыцца. Праз пэўны час ён парадуе новымі адкрыццямі.

Ганна ЦІХАЧОВА, студэнтка ВДУ імя П.М. Машэрава

С. Бабенка дэманструе зброю

15 лютага 1989 г. закончыўся вывад савецкіх войскаў з тэрыторыі Афганістана. Удзельнічалі ў той вайне і сотні беларускіх хлопцаў.

Трыццаць гадоў пасля вайны

Тое, што мой бацька служыў у Афганістане, у нашай сям'і ўзгадваюць нячаста. Звычайна гэта здараецца, калі, перабіраючы дакументы, нехта натрапляе на пасведчанні да медалёў – «Казленю Івану Пятровічу ад удзячнага афганскага народа». Бацька і сам рэдка кажа пра Афганістан, а калі ўжо заходзіць такая гаворка, вельмі скупіцца на словы. Далёка не ўсе нашыя родныя і сябры ведаюць, што бацькава служба ў войску была на самой справе вайной у Афганістане. Неяк на пытанне адной сваячкі: «Ну, як там было?» ён адказаў, што пасля таго, што там было, можна або спіцца, або налажыць на сябе рукі – ці паспрабаваць забыць тое і жыць далей.

Жнівень 1983 г.

З хлопцамі, што служылі разам, ніякіх стасункаў у бацькі не захавалася. Складана было гэта зрабіць – усіх раскідала жыццё. У адной роце з бацькам служылі ўкраінцы, рускія, чувашы, татары і беларус з Карэліі. Пасля дэмабілізацыі, калі былыя ўжо саслужыўцы раз'язджаліся па розных кутках Савецкага Саюза, бацька не паехаў разам з усімі на чыгуначны вакзал. У аэрапорце ён узяў квіток на бліжэйшы рэйс у бок Беларусі. Бліжэйшым аказаўся самалёт да Кіева, але было ўжо не так важна, куды ляцець. Толькі б хутчэй – адтуль. Дадому.

У войска бацька пайшоў пасля першага семестра ў Паўночна-Заходнім політэхнічным інстытуце (што ў Ленінградзе). Пад час вучобы ён працаваў на заводзе і з ягонай спецыяльнасцю меў бронь ад прызыву ў армію. Каб трапіць на службу, бацьку давялося вывучыцца ў ДТСААФ на вадзіцеля. Спачатку ён служыў паўгода ў вучэбным батальёне ў Літве, непадалёк Каўнаса, пасля – у вучэбным цэнтры пад Віцебскам. Адтуль іх і адправілі ў Афганістан. Перад самым ад'ездам нампаліт перад строем сказаў толькі: *«Сынкі, вяртайцеся жывымі»*.

Трапіўшы ў дывізію паветрана-дэсантных войскаў, бацька стаў дэсантнікам – і шафёрам аўтамабільнай роты. Іх рота забяспечвала полк боепрыпасамі і харчаваннем пад час вучэнняў (так у нас называліся баявыя дзеянні ў Афганістане; невядома толькі, што ж тады называлася вайной). Мой бацька не браў удзел у небяспечных вылазках, не адстрэльваўся са сховішча ад афганскіх баевікоў, не падымаў за сабою ў атаку салдатаў. Свае паўтара гады ў Афганістане, дзе год залічваўся за тры, ён правёў за рулём старога ГАЗ-66, з аўтаматам на каленях і гранатамі пад сядзеннем. Аўтамат быў на той выпадак, калі сустрэнуцца маджахеды (афганскія баевікі). Гранаты – для сябе. Дзякуй Богу, майму бацьку яны не спатрэбіліся.

А бывала рознае. Аднойчы, яшчэ напачатку службы, машына, якую вёў бацька, сапсавалася, і ён ды прапаршчык, з якім ехалі разам, адсталі ад сваёй аўтакалоны. Ім заставалася яшчэ больш за паўдня дарогі. Давялося ехаць адным. Па пакручастай дарозе, дзе з аднаго боку – горы, а з другога – прорва, і з-за кожнага павароту мог быць стрэл. «Нас тады сапраўды маглі забіць. І аднаго баевіка хапіла б, – сказаў бацька, – а мы, напэўна, і не паспелі б зразумець, што адбываецца».

Адным разам (было гэта ў жніўні 1983 года) аўтакалона грузавых машынаў, адну з якіх вёў мой бацька, выехала з Кабула. На сваім шляху яны павінныя былі пераехаць раку Панджшэр – па доўгім, каля 300 метраў, мосце. Але праехаць па ім аўтакалона так і не змагла – у кішлаку, што месціўся на супрацьлеглым беразе, сядзелі ў засадзе маджахеды. Яны пачалі страляць, калі машыны былі ўжо каля самага з'езда з моста. Некалькі першых аўтамабіляў былі падбітыя. Выхад знайшоўся хутка: маёр, які суправаджаў калону, загадаў страляць па кішлаку з бронетранспарцёраў. Неўзабаве амаль усе дамы былі зруйнаваныя, але ехаць далей усё роўна было немагчыма – баевікі стралялі з падвалаў. Аўтакалоне давялося перапраўляцца цераз раку за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад прызначанага месца. Вайна працягвалася.

Але для бацькі яна хутка скончылася. На пачатку лістапада 1983 года ён вярнуўся дадому, у невялікую вёску пад Івацэвічамі. І ў першыя дні пасля вяртання разам з мачыхай пайшоў у грыбы. Іх збірала мачыха, часам з асцярогай паглядаючы на хлопца. А ён проста хадзіў па лесе і не мог надыхацца баравым водарам – пасля разрэджанага горнага паветра, здавалася, грудзей не хапае, каб удыхнуць напоўніцу. Крыху кружылася галава – ці то ад свайго, роднага паветра, ці ад разумення таго, што ён жывы і нарэшце – дома. А праз два месяцы бацьку споўнілася дваццаць адзін.

Пагман, жнівень 1983 г. (першы злева – І. Казленя)

Ніна КАЗЛЕНЯ
Фота з альбома І. Казлені

Слоўка і музыка – песенны поспех

Не часта можна ўбачыць прыпыненыя людскія чэргі з кнігамі вакол невялікага прылавачка ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Запрошаныя госці чакалі аўтографаў аўтараў. Былі тут пісьменнікі ды аўтары «КГ» Сяргей Панізьнік, Раіса Аўчыннікава, Яўген Лецка, Сымон Барыс, былы музейшчык Ігар Карашчанка... Усіх не пералічыш. Было ў чарзе і шмат моладзі.

І ў антракце сабраўся людскі натоўп прыхільнікаў творчасці Уладзіміра Пецюкевіча і Дзмітрыя Даўгалёва, чыя вечарына была ў той дзень. Нават з-за духоўнай доўгачаканай цудоўнай падпіткі слухачоў не ўсіх прывабілі і пачастункі буфета. Ён трошкі запоўніўся напрыканцы свята, дзе працягнулася гаворка пра слаўны дуэт. Гучалі пажаданні працягу іх творчага шляху.

Падзея адбылася 29 студзеня ў вялікай зале філармоніі пад час ушанавання двух таленавітых самародкаў: выдатных паэта-песенніка У. Пецюкевіча і славутага кампазітара Д. Даўгалёва.

Сталічная філармонія, атуленая незвычайным святлом, нікога з прысутных і запрошаных не расчаравала. Песні У. Пецюкевіча і Д. Даўгалёва гучалі і насустрач гасцям, і ў зале.

Дарэчы, як высветлілася, у «сэрцы філармоніі» выканаўцы твораў выступалі напярэдадні 70-годдзя вядомага творцы, аддадзенага жыццялюбца У. Пецюкевіча.

Валодзя, як называлі яго ў Беларускім музеі народнага дойлідства, умеў дайсці і закрануць сэрца музейшчыкаў і наведнікаў сваёю жыццёвай праўдай у штодзённай працы. Ён сваімі рукамі стварыў у сектары «Паазер'е» (Віцебшчына) экспазіцыю ў помніку вяночнага тыпу «Будзічы». Стаўся загадчыку аддзела экспазіцыі музея помнік жыццёвым лёсам. Пасля працы электрыкам, калі падключаў энергію людзям, быў у музеі прызнаным народным паэтам-песеннікам, далучыў і Д. Даўгалёва.

У філармоніі былі шчаслівыя артысты. Яны духоўным гонарам свяціліся на сцэне побач з гаспадарамі свята – паэтам і кампазітарам. Паўнюткая зала – ад партэра да галёркі – сустракала воклічамі «брава», кветкамі і працяглым рытмічным пляскам далоняў. А развітанне... Усе артысты ад народных (Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч), ад заслужаных і лаўрэатаў (Валерый Дайнэка, Наталля Кірыенка, Ігар Ляўчук, Ірына Дарафеева, Пётр Ялфімаў, Анастасія Арцем'ева, Анастасія Ціхановіч, Сяргей Герасімаў, Вольга Клімовіч) да маладзейшых разам выйшлі напрыканцы на сцэну. Глядацкая падтрымка ў зале была ўзрушанай. Доўга не адпусклі прысутныя стваральнікаў свята.

Вершы з кнігі У. Пецюкевіча «Струны пілігрыма» чытаюцца лёгка, таму што выказаныя праз душу, любоў да Бога, сваёй Радзімы. З імі мы мяркуем пазнаёміць сяброў газеты пазней.

Георгій ТКАЦЭВІЧ

Дзе варта пабываць

120-ы юбілей

18 лютага споўніцца 120 гадоў з дня нараджэння Максіма Іванавіча Гарэцкага, празаіка, драматурга, літаратуразнаўца, перакладчыка, лексікографа, фалькларыста, акадэміка Беларускай акадэміі навук. Яго жыццё трагічна абарвалася пад час палітычных рэпрэсіяў 1930-х гадоў. Але шматгранная дзейнасць М. Гарэцкага пакінула свой след, стала яркай і адметнай старонкай у гісторыі беларускай літаратуры, увайшла ў скарбніцу сусветнай культуры. Яго творы перакладзеныя на балгарскую, латышскую, літоўскую, нямецкую, польскую, рускую і іншыя мовы свету. Запіскі «На імперыялістынай вайне» пастаўленыя літаратуразнаўцамі ў адзін шэраг з творамі А. Барбюса, А. Цвейга, Э.М. Рэмарка і іншых сусветных майстроў ваеннай прозы.

У фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь захоўваюцца ўнікальныя прыжыццёвыя выданні М. Гарэцкага, яго публікацыі ў перыядычным друку тых гадоў і іншыя матэрыялы, якія датычацца жыцця і творчасці самабытнага і яркага мастака слова. Да юбілею пісьменніка аддзелам старадрукаў і рэдкіх выданняў падрыхтаваная выстаўка «Максім Гарэцкі. Асоба і час». Экспазіцыя дае рэдкую магчымасць убачыць першы зборнік пісьменніка «Рунь», які выйшаў у 1914 годзе, аповесць «Дзве душы» (1919), апавяданне «Антон» (1919), «Гісторыя беларускае літаратуры» (1920) і інш.

Прыцягваюць увагу матэрыялы, якія датычацца родных і блізкіх пісьменніка. Кнігу «Народныя песні з мелодыямі» (1928) М. Гарэцкі выдаў з прысвячэннем сваёй маці Ефрасінні Міхайлаўне, ад якой запісаў шмат народных песень. Прадстаўленыя выданні Леаніды Усцінаўны Чарняўскай (Гарэцкай), жонкі пісьменніка, якая рупліва працавала не толькі на ніве педагогікі, а зрабіла значны ўнёсак і ў літаратуру.

Аб шырыні дзейнасці Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага, брата пісьменніка, выдатнага геолага, акадэміка АН БССР, доктара геолага-мінералагічных навук распавядае літаратура, прысвечаная жыццю вучонага. Плённа працуе на ніве беларускай навукі Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі, сын Гаўрылы Іванавіча і пляменнік Максіма Іванавіча, геолаг, геатэктонік, акадэмік НАН Беларусі, грамадскі дзеяч. На выстаўцы экспануюцца выданні, якія перадаў Радзім Гаўрылавіч у дар Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь.

Выстаўка будзе працаваць да 20 лютага.

Тэлефон для даведак – (017) 222-45-20 (аддзел старадрукаў і рэдкіх выданняў).

Паводле інфармацыі арганізатараў

Іранізмы ў п'есах Максіма Гарэцкага

Максім Іванавіч Гарэцкі – беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, публіцыст, фалькларыст, лексікограф, грамадскі дзеяч, акадэмік АН Беларусі (1928–1930). Зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё беларускай культуры, у фармаванне нацыянальнай свядомасці. Нарадзіўся 18 лютага 1893 г. у вёсцы Малая Багацькаўка Мсціслаўскага раёна. Скончыў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча (1913). У 1914–1917 гг. быў на фронце. З канца 1917 г. у Смаленску, супрацоўнічаў у газетах «Известия Смоленского Совета», «Звезда» (1918), з рэдакцыяй якой на пачатку 1919 г. пераехаў у Вільню. Працаваў настаўнікам Віленскай беларускай гімназіі. Быў рэдактарам і выдаўцом газет «Наша думка» (1920–1921) і «Беларускія ведамасці» (1921–1922). У 1922 г. арыштаваны і зняволены ў Лукішскую турму. З 1923 г. у Мінску. Выкладаў беларусазнаўства на рабфаку БДУ, беларускую мову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце Беларусі. Працаваў у Інбелкульце (з 1925 правадзейны член), у Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі (1926–1928), у АН Беларусі. У ліпені 1930 г. беспадстаўна арыштаваны, высланы ў Вятку. З 1935 г. выкладаў рускую мову і літаратуру ў пасёлку Пясочня (цяпер г. Кіраў, Расія). У 1937 г. зноў арыштаваны, у 1938 г. прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1957 г.

М. Гарэцкі – адзін з пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы: аповесць «Дзве душы» (Вільня, 1919), дакументальна-мастацкі дзённік «На імперыялістычнай вайне» (1926), раман «Віленскія камунары» (1931–1932, апублікаваны ў 1963), аповесць «Камароўская хроніка» (апублікаваная ў 1966) і інш. Аўтар «Гісторыі беларускае літаратуры» (Вільня, 1920; 3-е выд. 1924; факсімільным выданнем выйшла ў 1992), слоўнікаў «Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік» (1919), «Практычны расійска-беларускі слоўнік» (1924, разам з М. Байковым), зборніка «Народныя песні з мелодыямі» (1928, з А. Ягоравым) і інш. Творы пісьменніка перакладзеныя на балгарскую, латышскую, літоўскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую мовы. На радзіме пісьменніка ў в. М. Багацькаўка створаны музей, пастаўленыя помнікі ў Мінску, Вязьме, імем Гарэцкага названыя вуліцы ў Мінску, Мсціславе, Горках. У 1997 г. створаны Міжнародны фонд братоў Гарэцкіх.

У літаратурнай спадчыне М. Гарэцкага даволі значнае месца займаюць драматургічныя творы. Ужо напачатку сваёй дзейнасці пісьменнік «не абмяжоўваўся якой-небудзь адной жанравай формай, а ахвотна спрабаваў свае сілы ў розных жанрах, у тым ліку – у драматычных» (М. Мушынскі).

М. Гарэцкі – аўтар п'есаў «Атрута» (1913), «Антон» (1914), «Гапон і Любачка» (1914), «Мутэрка» (1920), «Салдат і яго жонка», «Свецкі чалавек», «Не адной веры», «Каменячос», «Чырвоныя ружы», «Жалобная камедыя», «Жартаўлівы Пісарэвіч» (усе 1922). Называючы свае п'есы «драматычнымі абразкамі, пісьменнік тым самым засведчыў іх жанравую спецыфіку, іх прыналежнасць да драматычнага і эпічнага родаў літаратуры» (М. Мішчанчук).

У 1990-я гг. з вяртаннем спадчыны і імя М. Гарэцкага ў літаратуру адрадзілася цікавасць і да яго драматургічнай творчасці. Баранавіцкім народным тэатрам пастаўленая «Атрута» (1981), Краснапольскім народным тэатрам – спектакль «Стогны душы» (1992) паводле аднаактовак «Салдат і яго жонка», «Свецкі чалавек» і «Атрута» (паказаны ў 1993 г. у Горках і ў Мінску на вечарыне з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння М. Гарэцкага). На беларускім тэлебачанні ставіўся спектакль паводле п'есы «Салдат і яго жонка» (1980; Т.Я. Гаробчанка).

Адна з асаблівасцяў драматургічных твораў М. Гарэцкага – майстэрскае выкарыстанне элементаў камізму.

Так, у сатырычным творы «Гапон і Любачка» пісьменнік «з'едліва, дасціпна высмеяў духоўнае ўбоства, унутраную спустошанасць, мізэрнасць людзей, якія ўсур'ёз прэтэндавалі на званне інтэлігентаў» (М. Мушынскі) – папа Малахія, настаўнікаў царкоўнапрыходскай школы Гапона Гапонавіча і Любові Іванаўны.

Жартаўлівы Пісарэвіч, персанаж аднайменнага драматычнага абразка, мае вялікую сілу волі: нават будучы хворым, ён пастаянна жартуе – не толькі з сябе, але і з навакольнага свету. У п'есе багата жартаў, смешных эпізодаў, тым не менш яна ўспрымаецца, як «камедыя-плач» – «па тых таленавітых, пісьменных, шчырых беларусах, якіх параскідаў лёс па розных канцах свету» (С. Лаўшук).

У вобразе Мутэркі, былога загадчыка двухкласнай школы, цяпер рэпетытара ў мястэчку, М. Гарэцкі «яркімі сатырычнымі фарбамі гнеўна закляймію тып прыстасаванца, дэмагога, абываценя» (М. Мушынскі), якому, як ён сам прызнаецца, семінарыя дала ўсё: «кавалак хлеба (значыцца, прафесію), маю цяперашнюю расейскую мову (за якую мяне амаль не ўсюдых лічылі чыстым русаком)». Як адзначае С. Лаўшук, Мутэрка адносіцца да «іванаў, якія не помняць роднасці»: «выракся роднай мовы, адцураўся не толькі свайго народа, але і кроўных блізкіх».

У творы «Свецкі чалавек» М. Гарэцкі «саркастычна-з'едліва» высмейвае... "свецкага" чалавека – Міколу Муху, які пагардліва глядзіць на бацькоў сваіх – "вясковую цемнату"» (С. Лаўшук). Звычайны маскоўскі швейцар, які прыехаў дамоў «*выбраць сабе пашпарт*», загадвае бацькам клікаць яго не Міколам, а Мікалаем Хведасеічам. Ён «з вялікім унутраным задавальненнем... здзекуецца з бацькі, з маці, з іх мужыцкай гаворкі» (М. Мушынскі).

Важную ролю ў драматургічных творах М. Гарэцкага пры стварэнні камічных сцэнаў, высмейванні адмоўных персанажаў адыгрываюць іранізмы – моўныя адзінкі, якія ў кантэксце выражаюць тонкую, прыхаваную насмешку.

Драма «Гапон і Любачка». Даведаўшыся, што настаўнік царкоўнапрыходскай школы Гапон заляцаўся да матушкі, Поп вырашыў правучыць яго: [Гапон:] *А! Дзень добры, бацюшка! Лезце і вы купаца, вада ўжо цёплая, добра! У здаровым целе – здаровы дух... Хух-хух-хух...* [Поп (маўчыць, потым шэпча):] *Купайся, купайся, паскуднік... Я цябе зараз* ***пакупаю...*** Пра тое, што дзеяслоў *пакупаю* ўжыты ў іранічным сэнсе ('правучу'), сведчыць наступны сітуацыйны кантэкст: улучыўшы момант, калі Гапон вылез на бераг, Поп секануў яго моўчкі з вялікай злосці пугаю па голым целе.

Іранічны сэнс укладзены Папом і ў словы (зараз) *паратуюць*: [Гапон (крычыць благім матам):] *Ратуйце! Ратуйце, гэта разбой!* [Поп:] *Зараз* ***паратуюць!*** (Рагоча ад злосці і трасе барадзішчаю.) *Ужо бягуць... Будзьце сведкамі, добрыя людзі, як я яго* ***пакупаў...*** (Сыпле пугаю шыбка і часта, але той ізноў уцёк у ваду.) Паказчык іранічна ўжытага Папом дзеяслова *паратуюць* – рэмарка *Рагоча ад злосці*, а дзеяслова *пакупаў* – рэмарка *Сыпле пугаю шыбка і часта...*

Апрача маўлення Папа, горкай іроніяй напоўненыя асобныя словы ў маўленні Дзяка і царкоўнага Старасты, якія прыбеглі «ратаваць» Гапона: [Гапон:] *Ратуйце, браткі! Бацюшка наш ашалеў... Трымайце яго...* [Поп (спакойна абтрасае мокрыя полы):] *Ты наперад ашалееш, паскуднае стварэнне! Глядзеце, як я яго* ***выкупаў.*** *Хай жаліцца на мяне цяпер!* [Дзяк (іржэ тоненька, як маладое жарабя):] ***Гі-гі-гі!*** *Во Іордані крэшчахуся...* ***Гі-гі-гі!*** [Стараста:] *Не хадзі, настаўнік,* ***курэй красці!***

Васіль РАГАЎЦОЎ

(Заканчэнне будзе)

Перыядычныя выданні Беларусі

Больш чым паўстагоддзя таму Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел Кніжнай Палаты БССР (што быў пры Дзяржаўнай бібліятэцы імя У.І. Леніна) выпусціў бібліяграфічны паказальнік «Периодическая печать Белорусии. 1817–1916 гг.» (Мінск, 1960), складзены вядомым бібліёграфам рэспублікі Адамам Сакольчыкам пад рэдакцыяй Ніны Ватацы. Паказальнік уключаў больш за 260 газетаў і часопісаў, куды ўвайшоў нават першы нумар выдання «Отечественный памятник...», выдадзены ў 1817-м. Даведнік не змяшчае кароткага апісання гэтага перыядычнага выдання, а складальнік не дае біяграфічных дадзеных пра яго заснавальніка, рэдактара-выдаўца. Таму дазволю сабе прывесці некаторыя з іх.

Першае рускае перыядычнае выданне на сучаснай тэрыторыі Беларусі з'явілася ў 1817 годзе ў Магілёве і называлася «Отечественный памятник, посвящённый дружелюбному соединению российских и польских народов». Яго заснавальнікам быў тытулярны саветнік, выкладчык і пісьменнік Фердынанд Францавіч Орля-Ашмянец. Ён нарадзіўся ў 1775 годзе ў Ваўкавыскім павеце ў сям'і небагатага шляхціца. Пасля заканчэння курса ў Галоўнай полацкай школе працаваў настаўнікам спачатку ў Дынабургскім павятовым вучылішчы, а пасля ў Віцебскім і Аршанскім. У 1800 годзе Ф. Орля-Ашмянец перайшоў настаўнікам у Полацкае вучылішча, а ў наступным годзе – у Рагачоўскае. У 1805-м ужо працаваў у Камянецкім вучылішчы, а праз 3 гады – у Курскай гімназіі. У 1813-м перавёўся ў Арлоўскую гімназію, дзе выкладаў некалькі дысцыплінаў: статыстыку, гісторыю, геаграфію, старажытнасці, міфалогію, а таксама «учёность римско-латинского языка».

У Арле Фердынанд Францавіч пачаў складаць і выдаў два перыядычныя выданні: «Друг Россиянин и их единоплеменников обоего пола или Орловский журнал на 1816 год» (выйшла 6 кніг) і «Отечественный памятник...» (выйшла 3 кнігі ў 1817 – 1818 гадах). Трэба адзначыць, што выданні сваёю мэтаю мелі *«утвердить в вечном союзе непоколебимого дружества умы и сердца славяно-российских и польских народов через посредство их просвещения и добродетели»* (заўважце: беларускага народа для аўтара не існуе. – **«КГ»**). Для дасягнення гэтай мэты рэдактар напаўняў выданні асабістымі сачыненнямі і, найбольш, прамовамі і «приятно сокращёнными сочинениями разных славнейших авторов». Увогуле, гэтыя выданні змяшчалі пераважна перадрукоўкі ўрыўкаў вершаў і прозы з часопісаў, што адпавядалі іх духу (у асноўным малазмястоўных), а таксама і з розных рускіх, польскіх і іншых пісьменнікаў. Але большасць твораў самога Фердынанда Францавіча так і не пабачыла свет.

З Арла ён пераехаў у Магілёў, дзе нядоўга працаваў выкладчыкам польскай і лацінскай славеснасці. Тут жа працягваў сваю выдавецкую справу: выдаў другую і трэцюю кнігі «Отечественного памятника...».

Апошняе месца службы Ф. Орлі-Ашмянца – Маладзечанскае вучылішча, дзе ён з 1818 года быў настаўнікам гісторыі, права, лацінскай і рускай моваў. Вось такая невялікая гісторыя першага рускага перыядычнага выдання ў Беларусі і яго рэдактара-выдаўца. Пра іншыя, больш цікавыя, дарэвалюцыйныя перыядычныя выданні нашага краю распавяду пазней, калі набярэцца дастаткова дакументальнага матэрыялу.

ДРУГЪ РОССІЯНЪ
И ИХЪ ЕДИНОПЛЕМЕННИКОВЪ
ОБОЕГО ПОЛА,
ИЛИ
ОРЛОВСКІЙ РОССІЙСКІЙ ЖУРНАЛЪ
НА 1816 ГОДЪ,
ИЗДАВАЕМЫЙ
Титулярнымъ Совѣтникомъ, и Орловской Губернской Гимназіи Старшимъ Учителемъ,
ФЕРДИНАНДОМЪ ОРЛЯ-ОШМЕНЬЦОМЪ.
ВЪ ОРЛѢ.

Amicitiae sanctum et venerabile nomen.
Ovidius.

N° I. ІЮЛЬ.

МОСКВА, 1816.
Въ Университетской Типографіи.

Вячаслаў **АФАНАСЬЕЎ**



Краязнаўчае краінаўства

Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1772/1795 – 1917 гг.)

Развіццё краязнаўчага руху ў 1772/1795 – 1864 гг.

Плённую краязнаўчую працу вёў малады чыноўнік Мікалай Рыгоравіч Гартынскі (1799–1887). Ён паходзіў з магілёўскіх мяшчанаў і з цікавасцю вывучаў архіўныя дакументы пра Магілёў, Мсціслаў, Полацк, Оршу ў бібліятэках і архівах каталіцкіх і ўніяцкіх кляштараў і храмаў, архівах казённых палатаў і інш. Ім адшуканыя прывілеі, дадзеныя Магілёву ў часы ВКЛ, напісаныя і апублікаваныя некалькі краязнаўчых працаў.

Да ліку грамадскіх арганізацыяў, якія падтрымліваліся імператарскім урадам, адносіліся Расійскае геаграфічнае таварыства (РГТ), Археаграфічная камісія ў Санкт-Пецярбургу (1834). Многія беларускія краязнаўцы ўдзельнічалі ў расійскіх і замежных грамадскіх арганізацыях: Маскоўскім археалагічным таварыстве, Кракаўскім навуковым таварыстве і інш. РГТ атрымлівала шчодрыя ахвяраванні імператараў – апекуноў таварыства, розных ведамстваў і міністэрстваў, а таксама прыватных асобаў. З таварыствам супрацоўнічалі многія беларускія краязнаўцы-этнографы. У якасці галоўнага напрамку ў сярэдзіне XIX ст. РГТ абрала фальклорна-этнаграфічную дзейнасць. У 1848 г. ва ўсе губерні была разасланая праграма «Інструкцыя этнаграфічная» для збору звестак аб знешнасці «туземных жыхароў», аб мясцовых гаворках, хатнім і грамадскім побыце, «аб разумовых і маральных здольнасцях», аб народных паданнях і помніках. Гэтую праграму падтрымала мясцовая адміністрацыя і мясцовыя даследчыкі. У Пецярбург пачалі паступаць шматлікія артыкулы і паведамленні з беларускіх рэгіёнаў. Лепшыя матэрыялы былі апублікаваныя ў «Вестнике имп. Русского географического общества»: «Песні сялянаў Навагрудскага павета» настаўніка Навагрудскага дваранскага вучылішча Дзмітрыева, «Статыстычны нарыс Навагрудскага павета» князя Радзівіла, «Этнаграфічныя звесткі пра сяло Цвяты Заслаўскага павета» святара Ф. Уласовіча і інш. Унікальным для тагачаснага краязнаўства быў факт удзелу ў этнаграфічным даследаванні вольнаадпушчанага селяніна Віцебскай губерні Мікалая Аніміле. Выпадкова ўбачыўшы ў мясцовага святара праграму даследавання, ён падрыхтаваў і выслаў у РГТ дзве працы, адна з якіх была выдадзеная пад назвай «Быт белорусских крестьян Витебской губернии» (1854). Краязнавец поўна і дакладна апісаў абрады і традыцыі: вяселле, хрысціны, памінкі, калядныя святы і інш. Так, Аніміле адзначае, што поўна вясельныя абрады спраўляюць толькі заможныя сяляне. Бедныя на вяселле не вараць піва, а замест яго падаюць квас.

Археаграфічная камісія «распорядилась о передаче ей старинных бумаг из западнорусских библиотек и архивов и успела приобрести огромные коллекции актов». З Магілёва, Мінска, Полацка і іншых месцаў дастаўляліся архівы былых цэркваў, магістратаў, павятовых судоў і іншых установаў на тэрыторыі Беларусі часоў ВКЛ. Археаграфічная камісія звяртала ўвагу даследчыкаў на значнасць пошуку дакументаў за XV–XVII стст., «когда в Западном крае наиболее проявлялась русская самобытность независимо от позднейшего влияния Польши». Пачалася публікацыя археаграфічных зборнікаў, у якіх змяшчаліся матэрыялы, прысвечаныя праваслаўнай царкве, уніяцтву, напрыклад, «Акты, относящиеся к истории Западной России» ў 5 тамах, рэдагаваныя І. Грыгаровічам.

У гэты час ў Беларусі яшчэ былі багатыя магнацкія архівы Радзівілаў, Сапегаў і іншых, у якіх зберагаліся дакументы, што пацвярджалі распаўсюджанасць сярод мясцовай эліты заходнееўрапейскай культуры і супярэчылі афіцыйнай дактрыне гісторыі краю. Архівы з канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. на працягу дзясяткаў гадоў заставаліся без належнага догляду і захавання, змянялі месца знаходжання, дакументы іх знікалі і гінулі. У прыватнасці, калі гродзенскі віцэ-губернатар у 1836 г. прагледзеў дакументы Сапегаў у Дзярэчыне, то адзначыў, што тут была перапіска прадстаўнікоў роду з французскімі, прускімі, польскімі каралямі, высокапастаўленымі асобамі. Але дакументы не зацікавілі чыноўніка, і архіў многа гадоў змяняў месца знаходжання, рассейваўся. Для параўнання, карціны, кнігі, манеты і скульптуры пасля канфіскацыі Дзярэчына і ўсіх іншых маёнткаў Я.К. Сапегі былі адпраўленыя ў Пецярбург, дзе большая частка твораў мастацтва была выстаўленая ў Эрмітажы.

Выдатнай з'яваю краязнаўства стала стварэнне Віленскага музея старажытнасцяў і археалагічнай камісіі пры ім. Заснаваныя яны былі па ініцыятыве Я. Тышкевіча ў 1855 г., у асноўным на яго сродкі, ён жа быў старшынёй музея і камісіі. Вядомы гісторык-краязнавец М.І. Балінскі быў прызначаны віцэ-старшынёй, а А.Г. Кіркор – сакратаром археалагічнай камісіі. Членамі музея і камісіі сталі вядомыя вучоныя і аматары, даследчыкі мінулага беларускіх зямель: К. Буйніцкі, Ю. Крашэўскі, А. Плятэр, Т. Нарбут, К. Тышкевіч, П. Тышкевіч і інш. Упершыню быў створаны калектыў, здольны вырашаць вялікія навуковыя задачы. Можна сцвярджаць, што Я. Тышкевічу ўдалося аб'яднаць усіх буйнейшых мясцовых гісторыкаў, археолагаў, этнографаў. Мару аб музеі, дзе былі б сабраныя мясцовыя старажытнасці, выдатны краязнавец выношваў не адзін год.

Віленскі музей старажытнасцяў быў адкрыты 1 студзеня 1856 г. у будынку Віленскага ўніверсітэта. Яго асновай з'яўляліся матэрыялы, сабраныя за многія гады Я. Тышкевічам, і бібліятэка. Члены камісіі таксама перадавалі ў музей каштоўныя прадметы даўніны. Так, К. Буйніцкі і А. Плятэр перадалі ў Віленскі музей старажытнасцяў свае калекцыі знаходак з Падзвіння і матэрыялы апісання Заходняй Дзвіны. Канстанцін Тызенгаўз падарыў арніталагічную калекцыю, на аснове якой адкрыўся чарговы кабінет музея. Дзве тысячы прадметаў прадстаўлялі першую ў мясцовай гісторыі археалагічную калекцыю. У музеі былі нумізматычны і мінералагічны кабінеты, калекцыі твораў мастацтва і іншыя экспанаты. Чучалы прадстаўнікоў фаўны адлюстроўвалі багацце беларускай прыроды.

Камісія штомесячна праводзіла пасяджэнні, на якіх заслухоўваліся і абмяркоўваліся рэфераты і навуковыя паведамленні краязнаўчага зместу. Звесткі аб дзейнасці камісіі публікаваліся ў віленскім друку, уважліва складаліся і абмяркоўваліся гадавыя справаздачы па выніках дзейнасці. Камісія выпусціла некалькі тамоў «Записок Виленской археологической комиссии». Заслугай камісіі з'яўляецца выданне археаграфічных зборнікаў. Сярод выданняў, якія не страцілі свайго значэння да нашага часу, былі «Збор граматаў» («Zbior dyplomatow») М. Круповіча (1858) і «Скарбніца граматаў» («Skarbiec dyplomatow») І.М .Даніловіча (1860–1862). «Скарбніца граматаў» была падрыхтаваная вядомым беларускім гісторыкам і крыніцазнаўцам І.М. Даніловічам (1787–1843), які адным з першых вывучаў прававую спадчыну ВКЛ. Два тамы змяшчаюць рознага роду інфармацыю ці перадаюць арыгінальны тэкст 2 383 дакументаў пра ВКЛ з часоў старажытнасці да 1569 г. Большасць матэрыялаў перакладзеная на польскую мову. У канцы кожнага дакумента пазначанае месца яго захавання або крыніца публікацыі. Гістарычныя дакументы адбіраліся Даніловічам адпаведна яго навуковым інтарэсам: прыведзеныя найцікавейшыя дакументы па гісторыі Полаччыны, Бельска (радзімы І.М. Даніловіча), прывілеі гарадам на магдэбургскае права, малавядомыя дакументы па гісторыі родаў і інш.

Валянціна САІТАВА

(Працяг будзе)

Працяг тэмы. Пачатак у №№ 21–23, 34–36, 42–44 за 2012 год, №№ 2–5 за 2013 год.

Люты-бацечка

Уздоўж

1. Калі на Макарыя (1 лютага) ..., то ўсю Масленіцу (прыкм.). **5.** Прагрэсіўны грамадскі дзеяч. **10.** Агаф'я .... Святая мучаніца, ахоўніца свойскай жывёлы; свята ў гонар яе адзначалася 18 лютага. **11.** Воўчы .... Так у народзе называлі Міколу Студзёнага, дзень якога адзначалі 17 лютага; да гэтага часу надыходзіла пара звярыных вяселляў. **13.** Сімвал 2013 года; згодна з усходнім календаром, з 10 лютага пачынаецца год чорнай вадзяной змяі. **14.** Паўднёвая расліна з пахкімі белымі кветкамі. **16.** Люты сонца на ... паварочвае (прык.). **18.** ... на дрэвах – да марозу, смуга – да адлігі (прыкм.). **19.** Месца злучэння дзвюх частак чаго-небудзь. **21.** «Шчокі ружавеюць – // ... хлопцаў грэюць». З верша «Першы снег» А. Дзеружынскага. **23.** Паляўнічы-прафесіянал. **25.** «А ў нас сёння ..., ..., // Зіма з летам сустрэлася, сустрэлася». З беларускай народнай песні. **29.** Асцярожнае стаўленне да каго-, чаго-небудзь. **30.** Збудаванне для падняцця дарогі на пэўную вышыню.

Упоперак

1. Імя прападобнага, свята ў гонар якога адзначалася 3 лютага. «На ... яснае надвор'е – будзе ранняя вясна» (прыкм.). **2.** Не хвалі жонку за ..., а хвалі за дзела (прык.). **3.** Раствор, якім пакрываюць прадметы, каб надаць ім бляск. **4.** «Змяіны ...». Верш М. Багдановіча. «Ў цёмным небе – хараводы». **6.** Газеты, радыё, тэлебачанне; усё разам (абрэв.). **7.** Прадукты харчавання. **8.** Зорнае ... на Трыфана (14 лютага) – позняя вясна (прыкм.). **9.** Вялікі загон для авечак. **12.** Той, хто жыве тут, не прыезджы. **13.** ... або Улас. Свята, якое адзначалася 24 лютага. «На Ўласа і барада ў масле» (прык.). **15.** Электрычна зараджаная часцінка. **17.** Адна бяда – не бяда, а калі дзве-... разам, тады бяда (прык.). **18.** Іголкападобнае лісце хвойных дрэваў. **20.** ... ў цяпле – малако на стале (прык.). **22.** Той, хто прысвяціў сябе служэнню навуцы, мастацтву і інш. (перан.). **24.** Даўнейшая назва шклозавода. **25.** Масленіца-палізуха: ... і масла палізала (прык.). **26.** Люты-бацечка збівае ... з зімы (прык.). **27.** Варона хавае ... пад крыло – да моцнага марозу (прыкм.). **28.** Біблейская жанчына, якую змей спакусіў яблыкам.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ



МНС напагатове

Толькі за першы месяц года ў нашай краіне адбылося 205 пажараў, агонь забраў 38 чалавечых жыццяў, у тым ліку 3-х дзяцей, а 34 чалавекі атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

Паводле статыстыкі найбольш распаўсюджанымі прычынамі пажараў у жылых дамах застаюцца наступныя:

– непатушаныя акуркі, пакладзеныя не ў попелку, а кінутыя на падлогу ці выпалыя з рук чалавека, які заснуў (часта ў нецвярозым стане);

– уключаныя электрапрыборы, пакінутыя без нагляду;

– парушэнне правілаў пры карыстанні прадметамі бытавой хіміі;

– няспраўная электраправодка;

– дзіцячае свавольства ці пакінутыя дома без нагляду малыя дзеці;

– парушэнне правілаў карыстання бытавымі газавымі прыборамі.

Цэнтральны раённы аддзел надзвычайных сітуацыяў чарговы раз нагадвае пра неабходнасць выконвання правілаў пажарнай бяспекі. У сучасным свеце не варта спадзявацца толькі на «авось». На жаль, менавіта такое стаўленне і самаўпэўненасць прыводзяць да трагічных здарэнняў. І да тых часоў, пакуль кожны грамадзянін не будзе адчуваць адказнасць за выкананне правілаў пажарнай бяспекі, лічбы статыстыкі будуць папаўняцца новымі ахвярамі.

Дзяніс ПРАЦЬКО,
начальнік ЦРАНС г. Мінска



Не ўсе знаходкі карысныя

Кожны чалавек мусіць ведаць і памятаць шэраг дзеянняў, якія неабходна выконваць, калі знойдзеныя незнаёмыя прадметы. Вельмі важна навучыць гэтаму маленькіх дзяцей, бо калі дарослы ў такой сітуацыі вырашае абысці знаходку і патэлефанаваць на нумар 101, то жаданне дзіцяці паглядзець, што там унутры, можа прывесці да трагедыі.

Не спяшайцеся падымаць забытыя торбу, заплечнік, каробку, які-небудзь прадмет, знойдзены ў пад'ездзе, каля дзвярэй кватэры, пад лесвіцай, у машыне ці грамадскім транспарце.

Ва ўсіх вышэй пералічаных выпадках нельга дакранацца, адкрываць, перасоўваць знаходку. Неабходна адысці на бяспечную адлегласць і паведаміць пра знаходку ў службу МНС па тэлефоне 101.

Вольга ЦЫНКЕВІЧ,
інспектар ЦРАНС г. Мінска

Ганчарная культура Дзедзіна

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 3–5)

Іван Барысавіч Цімашэнка: «Ад старых я наслухаўся шмат аповедаў пра прыгоды нашых навадзедзінскіх прадаўцоў гаршкоў. Як прадаваў аднойчы гаршкі Змітрок Цімашэнка (па мянушцы Лысак), ведала ўся вёска. Ён быў на Беразоўцы нашым суседам, і я яго добра памятаю. Гэта здарылася ўвосень і ў дакалгасны час яшчэ. Змітрок Пятровіч, прадаўшы гаршкі, вяртаўся дахаты паражняком – на калёсах не было ніякага грузу, акрамя сена пад мяккім месцам, каб не дрогка было ехаць. Праехаўшы Старыя Пранічкі, ён накіраваўся па сенажаці на Стары Дзедзін. Тады ў Старым Дзедзіне на рацэ стаяў млын з грэбляй, і ўзровень вады ў рацэ быў такі, што на Будзішча ці насупраць Красаўкі (Беладонны) уброд немагчыма было пераехаць. Таму пераязджалі па мосце ў Старым Дзедзіне ці ў Іванаўску.

Праязджаючы па лузе, ён звярнуў увагу на пранічаўскі стажок сена. Ужо сцямнела, каля яго вартаўнікоў не было відаць, і яму «дужа захацелася пазычыць сена з гэтага стажка». Змітрок нагрузіў на калёсы ношкі дзве сена і збіраўся ехаць далей. Але тут вынырнулі з цемры вартаўнікі і затрымалі яго.

Трэба прызнаць, што ў тыя даўнія часы крадзёж быў вельмі распаўсюджаны. Таму ўсе імкнуліся схаваць усё што можна пад замок, далей ад нячыстых на руку людзей.

Але Змітрок не разгубіўся і паспрабаваў выйсці з гэтага няпростага становішча. Ён прыкінуўся п'яным, а з п'янага, як у народзе кажуць, як з казла малака. Але гэта не збянтэжыла вартаўнікоў. Яны ўзялі лейцы ў рукі і гэтага «п'янага» Змітрака з крадзеным сенам павезлі ў вёску. Загналі калёсы на двор, распрэглі каня і зачынілі яго на замок у пуні. А Змітрака завялі ў хату і паклалі спаць на масніцах для працверажэння. Самі ж ляглі спаць з упэўненасцю, што самае галоўнае будзе заўтра: яны збяруць вясковы сход, пакажуць крадзенае сена і ўсёй вёскай прысудзяць злодзею пакаранне, каб у будучыні непанадна было красці.

Спаў ці не спаў Змітрок – мы не ведаем. Але ўначы, калі ўсе заснулі, ён падняўся і ціха выйшаў на двор. Са сваёй вупражы, якую не схавалі, і яна ляжала на калёсах, ён узяў толькі лейцы. Лейцамі ўвязаў ношку крадзенага сена, панёс і кінуў у раку. За два такія паходы сена на калёсах не стала, а рака яго панесла далёка ад Пранічак. Потым гэтак жа ціха зайшоў у хату і, як ніколі нічога, лёг і працягнуў на масніцах «працвераджацца».

Раніцай ён разам з усімі прачнуўся і ўжо «працверазеўшы» здзіўлена спытаў: «Але, чагой-та я тут?». Яму з задавальненнем растлумачылі, што ён злодзей, украў сена, і сёння яго чакае вясковы суд. Змітрок здзіўлена перапытаў: «Але, якое сена?». Яго павялі на двор да калёсаў, каб паказаць крадзенае, тыцнуць пысай і пазлараднічаць з яго п'янай непамятлівасці. Але выгляд пустых калёсаў прывёў вартаўнікоў у разгубленасць. Тое крадзенае сена нідзе ў вёсцы не знайшлі, і сход не адбыўся. Вось так навадзедзінскі мужык абвёў вакол пальца пранічаўскую шляхту.



(Працяг на стар. 8)

(Працяг. Пачатак на стар. 7)



Ганчарныя прылады працы: 1– пытлік, 2 – шыналі, 3 – зрэзка, 4 – ражок, 5 – мяшалка, 6 – ляшчоткі

Пасля вайны

Пасля вайны ў нас засталося дзейснымі толькі два горны: Лукашова і Шапарава. Апошні раз у нашым Новым Дзедзіне рабілі гаршкі ўзімку 1947 года. Мне было восем гадоў, і я паспрабаваў зрабіць гаршчок на крузе, але ён у мяне не атрымаўся.

У галодную вясну 1947 года мой бацька Міхась Антонавіч вазіў па вёсках прадаваць гаршкі «на сабе»: на самаробнай тачцы з дванаццацігадовай дачкой Людмілай (маёй сястрой). А Прося Гаўрылаўна Асіпенка (па мужы Карнеіха), што засталася пасля вайны ўдавой з пяццю дзецьмі, узімку 1947 года ўласнаручна зрабіла горан гаршкоў і выпаліла іх. У тую ж вясну разам з дзецьмі яна ў мяшку гэтыя гаршкі насіла па вёсках прадаваць. Гэта быў вельмі і вельмі цяжкі хлеб.





Нажныя ганчарныя кругі (1–4 – з нерухомай воссю, 5 – з рухомай)

Ганчарныя кругі ў нас амаль не захаваліся. Дыскі ад круга цяпер часам выкарыстоўваюць для гнёту пры засолцы гуркоў і квашанні капусты.

Старажылы Новага Дзедзіна, успамінаючы тыя часы, кажуць, што ежа, звараная ў рускай печы ў гаршку, была смачней, чым цяпер, звараная ў чыгунку ці ў каструлі.

Цяпер невялікія здзірванелыя ўзгорачкі і мноства раскіданых чарапкоў вакол нагадваюць пра тое, што калісьці тут быў горан, які дапамагаў нашым продкам выжываць. Гэта нялёгкае рамяство нікога не зрабіла багатым, ды і, напэўна, такога памкнення ў нашых людзей не было.

Ганчарную культуру Новага Дзедзіна дапамаглі апісаць:

Анастасія Еўдакімаўна Маханькова, 1922 года нараджэння;
Іван Ціханавіч Собалеў, 1932 года нараджэння;
Ягор Фёдаравіч Туркоў, 1928 года нараджэння;
Васіль Лукіч Ляпунаў, 1928 года нараджэння;
Іван Барысавіч Цімашэнка, 1935 года нараджэння.

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

Пра фестываль народнага гумару ў Аўцюках, што ў Калінкавіцкім раёне, ведаюць бадай усе ў Беларусі і нават за межамі краіны. Месца, дзе жывуць слынныя гумарысты, дзе жанчынаў называюць Калінкамі, а мужчынаў – Каласкамі, абзавялося і сваім календаром. Склалі яго пісьменнік, ініцыятар правядзення традыцыйных ужо фестываляў гумару Уладзімір Ліпскі і мастак, карыкатурыст Алег Карповіч.

На кожны дзень падабраныя жарты аўцюкоўцаў, пародыі і эпіграмы на сяброў фестывалю, карыкатуры і шаржы. А яшчэ складальнікі пакінулі месца на невялікія штодзённыя споведзі. Каб, як адзначаюць, напярэдадні будучага Новага года падсумаваць свой настрой. А споведзі яны прапануюць розныя.

Размясцілі іх у алфавітным парадку, складзеныя са словаў аўцюкоўскага лексікону. Вось прыклад некаторых. «А – адпачываў, адлежваўся, адлыньваў, ачухваўся, апахмяляўся», «Ё – ёкаў, ёрзаў, ёкнуў», «К – каўтнуў, кавалерыўся, какетнічаў, кампаніўся, кіпяціўся, кіснуў, кухарыў», «Н – нагаварыўся, налузаўся, намарыўся, напузырыўся», «Р – рагатаў, раяваў, расчуліўся, рыбаліў», «Т – таварышаваўся, траціўся, туляўся, тэлевізарыўся», «Х – хаўкнуў, хахаліўся, хіхікаў», «Ч – чайханіўся, чакушкаўся, чапурыўся, чарніліў, чапляўся, чытаў», «Я – языкаўся, яўкаў, яднаўся».

Мы ж прапануем чытачам «Краязнаўчай газеты» зазірнуць у смяшліва-гумарыстычны край. І будзем прапаноўваць сваім чытачам жарт тыдня з таго календара. Пачнем!

Аўцюковец паехаў у раён узяць патрэбную даведку. У яго пытаюцца:
– Кім працуеш?
– Упраўляючым.
– У вас жа калгас. Кім упраўляеш?
– Канём.

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

МІЛАГРА́ДСКАЯ КУЛЬТУ́РА (*заканчэнне тэмы*) – Неўмацаваныя пасёлкі – селішчы – вядомыя амаль на ўсёй тэрыторыі культуры, але значна радзей, чым гарадзішчы.

Пахавальныя помнікі – курганныя і бескурганныя могільнікі з пахавальным абрадам трупапалажэння і трупаспалення.

Асноўны тып жылля – наземныя або злёгку заглыбленыя ў грунт дамы плошчай 12–16 м². Яны былі, як правіла, прамавугольныя ў плане, мелі слупавую канструкцыю, у цэнтры пабудоваў размяшчаліся слупы, што служылі адной з апораў перакрыцця страхі. Характэрная асаблівасць жытлаў – наяўнасць выступу ў адной са сценаў або вуглоў. Адкрытыя агнішчы размяшчаліся ў круглых або авальных ямах паміж цэнтральным слупам і сценкай. Для гаспадарчых мэтаў выкарыстоўваліся пабудовы тыпу хлявоў і ямы-пограбы.

Насельніцтва вырабляла гаршкі з прамым адагнутым вонкі венчыкам і яйка- і шарападобным тулавам, а таксама паўсферычныя пасудзіны без вылучанага венчыка. Частка керамікі ўпрыгожаная ямкавымі або пазногцевымі ўціскамі, нанесенымі па венчыку або шыйцы, радзей – у верхняй частцы тулава. Часам уціскі згрупаваныя па 2–3 або складаюць трохвугольныя фігуры.

Былі пашыраныя разнастайныя бронзавыя і жалезныя бранзалеты, шыйныя грыўні, скроневыя кольцы і пярсцёнкі, завушніцы, падвескі, фібулы, посаха- і цвікападобныя шпількі, пранізкі, бляшкі, шкляныя, халцэдонавыя, бурштынавыя, гліняныя, бронзавыя пацеркі, гліняныя фігуркі жывёлаў.



Бронзавыя бранзалеты з гарадзішча Гарошкаў Рэчыцкага раёна

«МІНЕІ-ЧЭЦЦІ» (ад грэч. *menaios месячны* + стараж.-рус. *четье – чытанне*), «Штомесячныя чытанні» – царкоўна-рэлігійныя зборнікі твораў павучальнага зместу. Уключалі жыціі святых, павучанні, словы, казанні, размеркаваныя па месяцах у адпаведнасці з днямі ўшанавання царквою памяці кожнага святога. Прызначаліся для штодзённага чытання.

Узніклі ў Візантыі ў IX ст. На Русі вядомыя з XI ст., асабліва пашыраныя ў XVI ст. у сувязі з умацаваннем ідэалагічных асноваў самадзяржаўя і стварэннем культу агульнарускіх святых. З ініцыятывы маскоўскага мітрапаліта Макарыя ў 1530–1540-я гг. складзеныя «Вялікія Чэцці-Мінеі» ў XII ст., у якіх сабраныя творы царкоўна-апавядальнай і духоўна-павучальнай літаратуры Русі ад пачатку хрысціянства, а таксама ўключаны шэраг помнікаў старажытнарускай літаратуры. Амаль пасля кожнага жыція або казання змешчанае «Слова» айцоў царквы ці твор свецкага зместу. У складзе «Мінеі-Чэцці» дайшлі спісы найкаштоўнейшых помнікаў старажытнарускай літаратуры.

У XVII ст. на аснове макар'еўскіх «Мінеі-Чэцці» створаныя «Мінеі-Чэцці» Германа Тулупава і Іаана Мілюціна. У канцы XVII – пачатку XVIII ст. Дзімітрый Туптала (Дзімітрый Растоўскі) на аснове рускіх «Мінеі-Чэцці» і заходніх крыніцаў склаў 12-томны збор жыцій святых.

На тэрыторыі Беларусі вядомыя кнігі «Мінеі-Чэцці» камянецкая і жыровіцкая (XV ст.), слуцкая (XVI ст.), супрасльская рукапісная і друкаваная «Мінея агульная», віленская рукапісная (усе XVII ст.).

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 14.02.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 111.
Тыраж 1050 асобнікаў.